# 20 год Гродзенскай дыяцэзіі (41)

Аўтар: Рэдакцыя
13.01.2013 01:00

2011 год

17 верасня - У санктуарыі ў Тракелях адбылася І Дыяцэзіяльная сустрэча аніматараў і ўдзельнікаў дзіцячых і моладзевых рухаў. Сустрэчу ўзначаліў кс. бп Аляксандр Кашкевіч.

30 верасня - У парафіяльным касцёле ў Гродне ў мікрараёне Паўднёвы ўрачыстую св. Імшу з нагоды 55-й гадавіны святарскага служэння адправіў кс. прэлат Юзаф Трубовіч.

7 кастрычніка - У гродзенскай катэдры моладзь з Гродна малілася на ружанцы па тэлефоне з моладдзю са Шчучына, Ліды, Ваўкавыска і Смаргоні. † 8 кастрычніка
- У касцёле Найсвяцейшага Адкупіцеля ў Гродне кс. бп Аляксандр удзяліў дыяканскія пасвячэнні Эдуарду Петэльчыцу..

9 кастрычніка - Душпастарства настаўнікаў і выхавацеляў адзначала 10-годдзе свайго існавання.

15 кастрычніка - У Гродне ў мікрараёне Дзевятоўка пастар дыяцэзіі ўрачыста асвяціў касцёл.

29 кастрычніка - З нагоды 70-й гадавіны смерці св. Максімільяна Кольбэ і 20-годдзя ўзнікнення Гродзенскай дыяцэзіі адбыўся сімпозіум і ўрачыстая св. Імша пад кіраўніцтвам кс. аб-па Тадэвуша Кандрусевіча.

12 лістапада - Моладзь Гродзенскай дыяцэзіі прыняла ўдзел у сустрэчы з братамі з Тэзэ ў Мінску.

21 лістапада - У Лідзе адбылося асвячэнне помніка – знака-сімвала хрысціянскай еднасці. На ўрачыстай цырымоніі прысутнічаў кс. бп Аляксандр Кашкевіч.

8 снежня - У катэдральнай базіліцы пяць выхаванцаў Гродзенскай ВДС атрымалі дыяканскія пасвячэнні.

19 снежня - На аплаткавую сустрэчу святароў у Лідзе прыбыў Апостальскі нунцый кс. абп Клаўдыа Гуджэроці.